ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
19
МАЯ
ЧАЦВЕР
№ 19 (1395)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

## ВЫНІКІ

традыцыйнага агляду-конкурсу насценнага друку падвяла камісія па нагляднай агітацыі партыйнага камітэта універсітэта. Месцы сярод насценак факультэтаў размеркаваліся наступным чынам: біялагічны, фізічны, ФПМ і факультэт радыёфізікі і электронікі, механіка-матэматычны, філалагічны, хімічны, юрыдычны, журналістыкі, гістарычны, геаграфічны.

Ю. ВАРАТНІЦКІ,
кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.

## РАБОТА ПРЭС-ЦЭНТРА

разгледжана на пасяджэнні бюро камітэта камсамола універсітэта. Адзначаны станоўчы вопыт работы прэс-цэнтра па асвятленню камсамольскага жыцця факультэтаў і універсітэта ў друку.

У прынятай пастанове намечаны шэраг мер па актывізацыі работы сектараў друку на факультэтах і далейшаму паляпшэнню дзейнасці прэс-цэнтра.

А. МАТУСЕВІЧ,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола.

## КАМІТЭТ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

на чарговым пасяджэнні правёў нараду са старшынямі груп НК, на якой абмяркоўваліся пытанні паляпшэння працоўнай дысцыпліны. Быў таксама зацверджаны план мерапрыемстваў па рэалізацыі крытычных заўваг, выказаных на справаздачна-выбарнай канферэнцыі КНК.

Н. АЛЕГАВА.

## СПАБОРНІЦТВЫ БАСКЕТБАЛІСТАЎ

на кубак Мінаблсавета «Буравеснік» памяці Героя Савецкага Саюза І. Казінца прайшлі ў Мінску. У іх удзельнічала 8 жаночых і 9 мужчынскіх каманд ВНУ горада. Сустрэчы паміж жаночымі камандамі закончыліся бліскучай перамогай баскетбалістак універсітэта. Мужчыны БДУ — «бронзавыя» прызёры.

В. ШХІНЬЯН,
супрацоўнік кафедры фізвыхавання і спорту.

## ПАЧЫНАЕЦЦА ПАДПІСКА

на перыядычныя выданні на 1984 год. Заяўкі на газеты і часопісы па ўстаноўленай форме неабходна падаць у аддзел камплектавання бібліятэкі універсітэта (галоўны корпус, п. 223) не пазней чым 15 чэрвеня 1983 года.

Л. ЗРУБОВІЧ,
загадчыца аддзела камплектавання бібліятэкі.






# «ПЛАНЕТА ЧАКАЕ АД НАС МІРУ, ЖЫЦЦЯ, СВЯТЛА І ЦЯПЛА!»

З КОЖНЫМ ДНЁМ шырыцца рух народаў свету за мір, разбраенне, за скарачэнне ядзернай зброі. Людзі добрай волі ў розных кутках свету выступаюць за аб'яўленне сваіх рэгіёнаў зонай міру, тэрыторыяй, свабоднай ад зброі масавага знішчэння, супраць размяшчэння на тэрыторыі іх краін новых і захавання ўжо існуючых амерыканскіх ваенных баз, якія ўяўляюць сабой пагрозу міру на нашай планеце.

Па ініцыятыве зямляцтваў замежных навучэнцаў з Алжыра, Балгарыі, Грэцыі, Кіпра, Лівана, Марока, Палесціны, Сірыі і Туніса ў БДУ імя У. І. Леніна адбыўся ўрачысты сход, які прайшоў пад лозунгам «Міжземнае мора—мора міру, Балканы—бяз'ядзерная зона».

У фае і актавай зале былі развешаны падрыхтаваныя самімі студэнтамі красамоўныя плакаты: «Не»—вайне!», «Хірасіма не паўторыцца!», «Не дадзім запаліць полымя ядзернай вайны!» і г. д. А побач фотавыстаўкі, якія расказваюць аб барацьбе і мірнай працы народаў краін Міжземнамор'я, як папярэджанне, што ўсё гэта можа быць знішчана ў полымі новай вайны.

З болем гаварылі выступаючыя аб пагрозе міру з боку імперыялістычных колаў.

**— Бязлітасная арыфметыка гонкі ўзбраенняў: 1 мільён долараў у мінуту затрачваецца на зброю, нягледзячы на тое, што ўжо зараз на кожнага жыхара планеты назапашана 20 тон узрывчаткі, а на кожнага жыхара Еўропы—60 тон. Гэта прымушае кожнага з нас аддаваць усе сілы барацьбе за мір, за шчасце, за будучае нашых дзяцей, унукаў і праўнукаў, —сказаў намеснік старшыні Беларускай рэспубліканскай камісіі садзейнічання Савецкаму фонду міру М. Ф. Ягораў.**

Прадстаўнікі Алжыра, Кіпра, Марока гаварылі аб тым, што раён Міжземнамор'я шмат гадоў з'яўляецца прадметам асаблівай прагнасці імперыялізму, які любой цаной імкнецца захаваць свае пазіцыі, ператварыўшы краіны ў фарпост для барацьбы супраць Савецкага Саюза і іншых сацыялістычных краін. Пацвярджэннем гэтых агрэсіўных планаў амерыканскага імперыялізму могуць служыць спробы ператварыць Кіпр у сваю ваенную базу.

**— Сведчаннем таго, што імперыялізм не абмяжоўваецца словамі, а, папіраючы рэзалюцыі ААН і рашэнні іншых міжнародных арганізацый і форумаў, перайшоў да ажыццяўлення сваіх планаў на сусветнае панаванне, могуць служыць падзеі ў Ліване і вайна Ізраіля супраць Сірыі, якая рыхтуецца зараз, — заявілі прадстаўнікі Лівана, Палесціны і Сірыі.**

38 гадоў прайшло з таго дня, калі быў разгромлены фашызм. Усе гэтыя гады СССР выступае ініцыятарам барацьбы за захаванне міру, вядзе гэтую барацьбу пастаянна, самааддана, нягледзячы на хлусню і паклёп аб «савецкай пагрозе».

**— Мы заклікаем да адзінства ўсе плямёны і народы. Мы— людзі, і планета чакае ад нас міру, жыцця, святла і цяпла! — сказаў старшыня Усеагульнага саюза туніскіх студэнтаў у Мінску Крыфа Жаліл.**

**— Праблема пагрозы вайны перарасла вузканацыянальныя рамкі адной краіны, — адзначыла Дора Дзімітрава, дэпутат Народнага сходу Народнай Рэспублікі Балгарыі, якая выступіла ад імя зямляцтва балгарскіх студэнтаў. — Залогам паспяховага зыходу нашай барацьбы служаць усё новыя і новыя мірныя ініцыятывы, з якімі выступае Савецкі Саюз.**

Грэчаскае зямляцтва накіравала ў адрас свайго пасольства ў Маскве зварот да ўрада Грэцыі, якое падпісалі прадстаўнікі зямляцтваў — арганізатараў урачыстага сходу. У звароце— патрабаванне ўзмацніць барацьбу за згортванне амерыканскіх баз на тэрыторыі краіны, і не на словах, а на справе.

Усе прысутныя паставілі свае подпісы пад петыцыяй, якая патрабуе ператварэння Міжземнамор'я ў зону міру, і Балкан — у бяз'ядзерную зону. Петыцыя перададзена Беларускаму аддзяленню Савецкага камітэта абароны міру для ААН.

**У. БУДАЙ,**
**кіраўнік інтэрпрэс-цэнтра.**

Фота **Саід Маруан Адэль** (Ліван).

# СТУДЭНЦКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

## ДА 165-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ К. МАРКСА

НЯДАЎНА прайшла рэспубліканская інтэрнацыянальная студэнцкая канферэнцыя, прысвечаная 165-годдзю з дня нараджэння і 100-годдзю з дня смерці Карла Маркса.

У канферэнцыі прынялі ўдзел замежныя студэнты, якія вучацца ў ВНУ БССР. З уступным словам выступіў начальнік аддзела па рабоце з замежнымі навучэнцамі і сувязях з замежнымі краінамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, кандыдат гістарычных навук І. П. Прымачук. Былі прачытаны даклады на тэмы: «Нікарагуа ў барацьбе за свабоду і нацыянальную незалежнасць», «Барацьба народаў Афрыкі супраць імперыялізму», «Карл Маркс і рэвалюцыйны Афганістан» і іншыя.

Актыўны ўдзел прынялі ў канферэнцыі замежныя студэнты універсітэта. Студэнтка II курса аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта Утэ Брайтэр (ГДР) падрыхтавала адно з найбольш цікавых выступленняў. Тэма яе даклада — «Карл Маркс і праблемы вайны і міру». У яго аснову былі пакладзены ідэі заснавальнікаў навуковага камунізму аб ролі рабочага класа ў барацьбе за мір. Асабліва падкрэслена думка Карла Маркса пра тое, што рабочы клас з'яўляецца рашаючай грамадскай сілай, якая можа забяспечыць мір. Утэ Брайтэр на аснове тэарэтычных вывадаў Маркса і Энгельса аб праблемах вайны і міру ахарактарызавала сучасны рэвалюцыйны працэс.

БДУ прадставіў на канферэнцыю 7 навуковых работ з 35 наяўных. Даклады студэнтаў гістарычнага факультэта Утэ Брайтэр і Рабэрта Гомэс Эрнандэса (Куба) адзначаны дыпломамі МінВНУ БССР, а навуковыя работы студэнта мехмата Нгуэн Ван Хоа (СРВ), студэнтаў гістфака Хайка Віля, Увэ Алекса (ГДР), Мусайды Зайфулы аз-Захры (НДРЙ), студэнта факультэта журналістыкі Лема Тадэсэ (Эфіопія) адзначаны граматамі МінВНУ БССР.

**ЖАРЖЫН РАВАУ**
**(Мадагаскар),**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## НА ПАРАДКУ ДНЯ — ДЫСЦЫПЛІНА

# Першаасноўа кожнай справы

НА ЛІСТАПАДАЎСКІМ (1982 г.) Пленуме ЦК КПСС справядліва адзначалася, што адным з рэзерваў павышэння прадукцыйнасці працы, лепшага выканання вытворчых заданняў з'яўляецца ўмацаванне працоўнай дысцыпліны — першаасновы кожнай справы.

Мы, студэнты, нясём сваю працоўную вахту ва універсітэцкіх аўдыторыях. Якімі станем спецыялістамі, залежыць ад таго, наколькі добрасумленна адносімся мы сёння да вучобы.

Юрыдычны факультэт дае рознабаковыя веды. Лекцыі па грамадзянскаму і крымінальнаму працэсу і праву, крыміналістыцы і псіхалогіі, грамадска - палітычных дысцыплінах праходзяць захапляюча і цікава. А калі вучышся з задавальненнем — і вынікі выдатныя. 116 нашых студэнтаў здаюць сесіі толькі на выдатна, некаторыя з іх займаюцца так на працягу ўсіх гадоў вучобы. Гэта — ленінскія стыпендыяты Раіса Бяляўская і Людміла Пэнда, узнагароджаныя знакам ЦК ВЛКСМ «За выдатную вучобу», Валерый Фамін, Алена Тарасенка, Міхаіл Міхалеп, Галіна Ганевіч і многія іншыя.

Аднак ёсць у нас і недахопы. Некаторых студэнтаў «упрыгожваюць» «хвасты». Гэта заўсёды непрыемна для факультэта. Б'юць трывогу акадэмічны сектар камітэта камсамола, камсамольскія бюро груп. Калі патрэбна дапамога — дапамагаем. Але, зразумела, не здымаем адказнасці з самога студэнта.

Сур'ёзнай праблемай застаецца ў нас тройка. Троечнікі — гэта не «хвасцісты», з якімі і на пасяджэнні вучэбна-выхаваўчай камісіі можна паразмаўляць, і на сходзе групы. З троечнікамі ўсё больш складаней: тройка ж адзнака станоўчая. Аднак заўтра гэтая здавальняючая адзнака ў залікоўцы адмоўна скажацца на рабоце.

З мэтай дапамогі ў падрыхтоўцы да заняткаў і экзаменаў са студэнтамі малодшых курсаў дзеляцца вопытам старшакурснікі і выдатнікі, выступаючы на сходах у групах, з артыкуламі ў насценгазеце «Савецкі юрыст». Але зроблена яшчэ недастаткова, і ў будучым годзе газету выдатнікаў факультэта неабходна актывізаваць сваю работу.

Паспяховая вучоба цесна звязана з наведваннем лекцый і практычных заняткаў. Даўно вядома: студэнт, які ўважліва слухаў лекцыі, разабраўся ў пытаннях на семінары, — і веды свае прывядзе ў сістэму хутчэй, і да сесіі падрыхтуецца лепш. А ў выніку — атрыманыя веды больш глыбокія і трывалыя. І наадварот, студэнт, які не наведвае заняткі, а спадзяецца на штурм у час сесіі — патэнцыяльны кандыдат у троечнікі.

На факультэце вялікая ўвага ўдзяляецца наведванню заняткаў. Гэтае пытанне пастаянна знаходзіцца пад кантролем дэканата, партбюро, камітэта камсамола. У нас працуе вучэбна - выхаваўчая камісія, у якую ўваходзяць намеснік дэкана М. К. Казлоў, адказная за вучэбную работу ў прафбюро Т. Лукашэнка, адказная за работу з першым курсам А. Залатухіна, С. Батук і іншыя. Кожны тыдзень праводзяцца кантрольныя праверкі наведвання лекцый. Матэрыялы рэйдаў разглядаюцца вучэбна-выхаваўчай камісіяй разам з дэканатам. Калі пропускі заняткаў выпадковыя — даводзіцца пачырванець на сходзе перад таварышамі па групе. А калі гэта пагражае перарасці ў прывычку, тут і пакаранне больш строгае: пасля гутаркі на вучэбна - выхаваўчай камісіі можна атрымаць і вымову з папярэджаннем. Асабліва злосных прагульшчыкаў заслухоўваюць на пасяджэнні камітэта камсамола факультэта.

Вялікую дапамогу ва ўмацаванні вучэбнай дысцыпліны аказвае штаб «Камсамольскага пражэктара», які ўзначальвае Святлана Карабцова.

Строгае захаванне вучэбнай дысцыпліны дае свае рэзультаты. Будзем спадзявацца, што відавочным прыкладам гэтага стане надыходзячая летняя экзаменацыйная сесія, якая прыбавіць добрых і выдатных адзнак у залікоўках.

**Л. КУРЫЛОВІЧ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола юрыдычнага факультэта па акадэмічнай рабоце.**

## ТВОРЧЫЯ КАНТАКТЫ



△

*Традыцыйнымі сталі на факультэце журналістыкі сустрэчы з літаратарамі. Нядаўна ў гасцях у студэнтаў былі беларуская паэтэса Вольга Іпатава і ўзбекскі празаік Ісфандзіяр.*

Фота С. Плыткевіча.

*Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Яўгенія Янішчыц прысутнічала на пасяджэнні літаратурнага аб'яднання «Рунь». На памяць аб сустрэчы яна ўручыла членам літаб'яднання зборнік сваіх вершаў з аўтографам.*

Фота В. Грамовіча.

▽



# ...І ПЯЦЬ СТУДЭНЦКІХ ГАДОЎ

УЧОРА ФАТОГРАФ ПРЫНЁС у рэдакцыю здымак. На ім выпускнікі факультэта журналістыкі 1983 года — мае аднакурснікі, таварышы, сябры. Па-



святочнаму апранутыя, з радаснымі і крыху засмучанымі тварамі: ведама ж, толькі-толькі адбылося размеркаванне — падзея ці не галоўная ў жыцці студэнта...

Якімі былі мы пяць гадоў назад? Школьнікі, рабочыя, калгаснікі, вайскоўцы, якіх — не, не сталая любоў да неспакойнай, часам няўдзячнай прафесіі журналіста, а рамантыка вандраванняў, прага далёкіх дарог прывялі ва універсітэцкія аўдыторыі. Мы, наіўныя, у думках былі разам з адважнымі палярнікамі, вялі рэпартаж з касмадрома, узнімаліся на горныя вяршыні і апускаліся на акіянскае дно. Мы бачылі сябе «нястрымнымі рэпарцёрамі».

Аднак усё аказалася значна прасцей. Нашы пёры спатрэбіліся перш за ўсё слесару і трактарысту, урачу і шафёру, аграному і настаўніку... Усім тым, хто з дня ў дзень робіць самую звычайную справу. Ну а калі хто не спасціг гэтай ісціны за пяць студэнцкіх гадоў (бывае, на жаль, і такое), то, бадай, не зразумее яе ніколі.

Кім сталі мы сёння? Спецыялістамі. Упэўнен, нашым выкладчыкам, нашаму універсітэту не варта хвалявацца за Галіну Міхнавец і Віктара Сабалеўскага, Галіну Сачанка і Андрэя Ганчарова, Таццяну Заенчукоўскую і Аляксандра Васількевіча. Кожны з іх знайшоў сваё прызванне, а разам з ім і сябе.

Якімі станем заўтра? Толькі час адкажа на гэта пытанне. Але ўжо цяпер хочацца верыць: не раўнадушнымі сузіральнікамі падзей, а іх актыўнымі ўдзельнікамі. «Журналіст мае цудоўную магчымасць спалучаць у адной асобе якасці педагога і юрыста, псіхолага і эканаміста. Яму дадзена вялікае права ўмешвацца ў жыццё людзей. А таму перш за ўсё ён сам павінен быць чалавекам, Чалавекам з вялікай літары». Думаю, што ніхто не аспрэчыць думку майго аднакурсніка камуніста Сяргея Багдановіча.

Праз два месяцы калектывы газет, рэдакцыі радыё і тэлебачання рэспублікі сустрэнуць новы атрад маладых журналістаў. Будуць сярод іх, безумоўна, вядомыя публіцысты і крытыкі, нарысісты і фельетаністы —зоркі першай велічыні. Будуць проста добрыя журналісты. Гэта наперадзе. А пакуль нам засталося зрабіць ва універсітэце ўсяго некалькі крокаў — здаць два экзамены. «Якое дзіва! Адолелі ж за пяць год больш за трыццаць, здадзім і два апошнія»,—падумае нехта. Яно то так. Ды толькі апошнія ўсім папярэднім роўныя — дзяржаўныя.

Што пажадаць вам, мае сябры? Вострага пяра, вернасці сваёй прафесіі, творчых удач. У добры шлях!

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**студэнт 5-га курса факультэта журналістыкі.**

СЁННЯ 89 студэнтам гістарычнага факультэта здаецца ўсё больш простым і лёгкім. А ці даўно да поўначы не спалі перад чарговым экзаменам і, як заўсёды, заставаліся недачытанымі некалькі старонак падручніка: не хапіла аднаго дня. Ці даўно ўляталі ў аўдыторыю праз некалькі хвілін пасля званка: праспалі, будзільнік падвёў.

— Здаецца, такога і не было, — усміхаецца Уладзімір Ільюхін. — Ды толькі не гэта галоўнае. Курс наш быў нядрэнны: і актыўны, і па паспяховасці ў хвасце не ішоў. Асабліва добра здалі апошнюю сесію. Мяркуйце самі: 44 чалавекі атрымалі выдатныя адзнакі і толькі тры студэнты маюць тройкі.

Так, нельга не пагадзіцца з Валодзем. Курс сапраўды вызначаецца роўнай здачай залікаў і экзаменаў, актыўным удзелам у грамадскім жыцці факультэта. Гэта можна сказаць пра Алену Качурку і Уладзіміра Сямёнава, Ірыну Кулакову (дарэчы, Іра—ленінскі стыпендыят) і Святлану Зялінскую і многіх іншых.

Многія студэнты на працягу ўсіх гадоў вучобы актыўна ўдзельнічалі ў навуковай рабоце: выступалі з дакладамі і паведамленнямі на факультэцкіх і універсітэцкіх навуковых канферэнцыях, на пасяджэннях гурткоў СНТ. Сярод іх Алена Гнацюк, Аляксандр Ляўшэвіч, Аляксандра Верашчагіна (тут да месца дадаць, што Саша ўзнагароджана граматай рэктарата за актыўны ўдзел у гуртку «Старажытны свет і сучаснасць»).

На думку пяцікурснікаў, касцяк групы складаюць студэнты, што займаліся на падрыхтоўчым аддзяленні. Яшчэ тады сфарміраваўся калектыў, вакол якога потым згуртаваліся першакурснікі. Уладзіміра Ільюхіна намеснік дэкана П. А. Шупляк ахарактарызаваў коратка: «Выдатнік, актывіст». Сапраўды, Валодзя быў і старастай, і старшынёй студсавета, і намеснікам сакратара камітэта камсамола факультэта па акадэмічнай рабоце, і членам прафкома універсітэта. Добрыя ўспаміны пакіне аб сабе на факультэце Ганна Васільева. Ведаюць яе як актыўную ўдзельніцу мастацкай самадзейнасці. Ніводнае мерапрыемства на факультэце не абыходзілася без Уладзіміра Здановіча, старасты курса, чалавека невычэрпнай энергіі, завадатара ўсіх цікавых спраў. Дэканатам адзначаецца як адзін з лепшых старастаў.

Дарэчы, аб мерапрыемствах. Калі я спытала ў пяцікурснікаў, якое праведзенае мерапрыемства ім найбольш запомнілася, яны амаль хорам адказалі: «Медыум». Чаму? Прайшоў цікава: былі тут і дасціпны гумар, і вясёлы жарт.

Непрыкметна праляцелі пяць гадоў вучобы ва універсітэце. Але ў багажы маладых спецыялістаў не толькі набытыя веды па спецыяльнасці, але і вопыт самастойнай працы. Тут навучыліся яны працаваць, не баяцца цяжкасцей.

...Пройдзе месяц-другі. 82 маладыя спецыялісты (7 чалавек будуць служыць у радах Савецкай Арміі) раз'едуцца ў розныя куткі рэспублікі: Мінскую і Віцебскую, Гомельскую, Брэсцкую і Магілёўскую вобласці, будуць вучыць дзяцей. Вучыць таму, чаму ў свой час вучылі іх: дабру, справядлівасці, шчырасці, павазе і любві да людзей... А калі што не атрымаецца, будуць успамінаць парады сваіх старэйшых таварышаў — былых выкладчыкаў: прафесара Льва Міхайлавіча Шнеерсона, дацэнтаў Ніны Антонаўны Гусаковай і Эдуарда Міхайлавіча Загарульскага, старшай выкладчыцы Жанны Барысаўны Чэпа—усіх, хто на працягу пяці студэнцкіх гадоў стараўся выхаваць у іх рысы сапраўднага прафесіяналізму, уменне не палохацца цяжкасцей, любоў да такой няпростай, але самай важнай справы на свеце — вучыць дзяцей.

**З. АЛЯШКЕВІЧ,**
**наш кар.**

# СУСТРЭЧА ВЫПУСКНІКОЎ

ЗДАЕЦЦА, ЯШЧЭ НЯДАЎНА наведвалі яны студэнтамі гэтыя аўдыторыі, слухалі лекцыі. Зараз, праз пятнаццаць гадоў, прыйшлі ўсе разам на факультэт журналістыкі як госці, як наведвальнікі.

...Паўтара дзесятка гадоў мінула з таго дня, як для студэнтаў гэтага курса прагучаў апошні званок. Празвінеў, каб раз'яднаць дружную студэнцкую сям'ю, раскідаць па раёнах і гарадах рэспублікі. Прыйшоў час скарыстаць тыя веды, якімі ўзбагацілі выкладчыкі за гады вучобы, паспрабаваць у працы свае сілы.

І вось яны зноў, як некалі дамаўляліся, разам. Сабраліся, каб не толькі паглядзець адзін на аднаго пасля працяглага расстання, падзяліцца апошнімі навінамі, паўспамінаць жыццё студэнцкае... Перш за ўсё падвесці вынік тых залікаў, якія так часта прымае жыццё, экзаменаў на прафесійнае майстэрства.

У 1968 годзе адбыўся выпуск. За гэты час з тых 27 студэнтаў курса 5 чалавек сталі рэдактарамі раённых і 9—супрацоўнікамі рэспубліканскіх газет, 2 — ваеннымі журналістамі, 3—партыйнымі, савецкімі і дыпламатычнымі работнікамі, 5—кандыдатамі навук, 3 чалавекі працуюць у сістэме Дзяржкамвыдавецтва БССР. Сярод выпускнікоў ёсць лаўрэаты прэмій Саюза журналістаў СССР, Ленінскага камсамола Беларусі, творчых конкурсных прэмій Саюза пісьменнікаў, ЦК ЛКСМБ і Міністэрства культуры БССР. Выдадзена ў свет 15 кніг і брашур, надрукаваны сотні артыкулаў. Адным словам, веды, атрыманыя ў час вучобы, укараняюцца ў жыццё партыйным публіцыстычным словам.

У заключэнне сустрэчы былыя выпускнікі факультэта выказалі падзяку дэканату, калектыву выкладчыкаў за арганізацыю сустрэчы, пажадалі студэнцкай сям'і новых здабыткаў у вучобе і творчых поспехаў.

**В. ГРАМОВІЧ.**

# НА ВАХЦЕ ПАМЯЦІ



*Тры дні ў легендарным Лаўскім лесе, на месцы стаянкі партызанскай брыгады імя Варашылава, праходзіў першы універсітэцкі злёт студэнтаў—удзельнікаў Усесаюзнага паходу па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.*

Светлае лісце маладых бяроз прагна цягнулася да шчырага майскага сонца. Лаўскі лес сустракаў сваю трыццаць восьмую пасляваенную вясну, сустракаў юнакоў і дзяўчат універсітэта.

Ва універсітэце ўжо даўно стала традыцыяй 8—9 мая праводзіць сустрэчы ветэранаў партызанскай брыгады імя Варашылава, ваяваўшай на гэтай самай зямлі супраць нямецка - фашысцкіх захопнікаў. А ў маі мінулага года камуністычны студэнцкі атрад адбудаваў зямлянкі на месцы партызанскага лагера ля вёскі Лавы. У будучым тут мяркуецца ўстанавіць мемарыяльныя пліты ў памяць аб загінуўшых.

Галоўнай мэтай злёту было падвядзенне вынікаў работы камсамольскіх, турысцкіх, спартыўных арганізацый па ўдзелу ва Усесаюзным паходзе рэспубліканскай аперацыі «Летапіс народнай славы» і ва Усесаюзнай экспедыцыі-пошуку камсамольцаў і моладзі «Летапіс Вялікай Айчыннай». Ініцыятарам і арганізатарам злёту быў камітэт камсамола універсітэта.

Злёт сабраў пад сваім сцягам адзінаццаць каманд, якія прадстаўлялі ўсе факультэты універсітэта.

Праз нейкую гадзіну пасля прыезду ў лесе вырас цэлы, усталяваны па ўсіх турысцкіх патрабаваннях, палатачны гарадок. Хлопцы рыхтавалі дровы, дзяўчаты прыбіралі ў лагеры,



разбіралі паходныя рэчы, а хімікі нават паспелі запрасіць да сябе ў госці ўсіх суседзяў, паабяцаўшы пачаставаць грэчневай кашай. Напружаная работа ішла ў штабе злёту і судзейскай калегіі. Там рыхтаваліся да правядзення спаборніцтваў па валейболу і спартыўнаму арыентаванню, ваенізаванай эстафеце, турысцкай паласе перашкод, конкурсаў на лепшую прапаганду турысцкага паходу, на лепшае усталяванне лагера і лепшы абед.

Два дні працягваліся спаборніцтвы. І што не магло не кінуцца ў вочы, дык гэта тое, што злёт яшчэ больш з'яднаў, здружыў студэнтаў. У ліку пераможцаў па тых ці іншых відах праграмы злёту сталі амаль усе каманды. У агульным заліку судзейскае журы назвала мацнейшымі па колькасці першых месц каманды ФПМ, біялагічнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі. Але галоўны пераможца — гэта сяброўства. І таму калі ў заключны дзень спаборніцтваў на агульным пастраенні ветэран партызанскага руху, былы камісар атрада «Патрыёт» Васіль Дзмітрыевіч Петухоў і сакратар парткома універсітэта М. Г. Елісееў уручалі ўзнагароды і граматы лепшым камандам, ім апладзіравалі ўсе.

У святочны Дзень Перамогі, як і звычайна, у Лаўскім лесе сабраліся ветэраны вайны і былыя партызаны. З імі ўдзельнікі злёту сустрэліся на мітынгу. Былыя салдаты, студэнты, жыхары навакольных вёсак хвілінай маўчання ўшанавалі памяць тых, хто загінуў у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

Потым перад прысутнымі выступілі былы камісар атрада імя Кутузава І. Я. Жыгаловіч, старшыня савета ветэранаў брыгады імя Варашылава А. С. Зюба, сакратар парткома універсітэта М. Г. Елісееў і студэнтка Маргарыта Корзун.

Асабліва запомніліся і запалі ў душу словы былога партызана брыгады, старшыні Узденскага гарадскога Савета народных дэпутатаў Канстанціна Іванавіча Караля, з якімі ён звярнуўся да моладзі:

— Пільна захоўвайце мір. Любіце сваю Радзіму. Будзьце заўсёды гатовы абараніць яе. Не забывайце, што памяць — гэта не толькі абеліскі, сардэчныя словы і кветкі. Памяць — гэта працяг справы, пачатай вашымі дзядамі і бацькамі...

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**член прэс-цэнтра камітэта камсамола.**



**НА ЗДЫМКАХ:** імгненні злёту.

Фота А. Жаліхоўскага і В. Сеўрука.

ФЕЛЬЕТОН

# У ЧАКАННІ СЛАВЫ

ШЛЯХ ДА СЛАВЫ. Якім жа ён бывае няпростым. Што за цяжкасці, што за перашкоды паўстаюць перад тымі, хто адважыцца зрабіць па ім першыя крокі! Але потым, у промнях славы, у цёплых хвалях папулярнасці, дасягнуўшы вяршынь, як прыемна ўспомніць мінулае, расказаць пра сябе нашчадкам ці проста сесці ды напісаць мемуары: «Маё студэнцкае жыццё, або Навука пра тое, як, з кім, дзе і калі распіваць напіткі крыху больш моцныя, чым кефір»...

Багатае мінулае і не менш насычанае сучаснае нашых герояў дазваляе спадзявацца, што нашчадкі не застануцца без падрабязнага апісання жыцця «зорак». Шлях да славы ў кожнага свой. На жаль, той, які выбралі нашы героі, часцей за ўсё заканчваецца хаджэннем па інстанцыях з просьбамі аднавіць іх ва універсітэце і зноў прыняць у камсамол. Многія з «гістарычных людзей» фізічнага факультэта, пра якіх і пойдзе гаворка, ужо атрымалі свабоду дзеянняў, пра якую так марылі, калі былі студэнтамі. Некаторым права на «вольны вобраз жыцця», відаць, яшчэ будзе дадзена.

## НЕ СВЯТАЯ ТРОІЦА

Варыянт быў амаль што класічны. Пачнем з таго, што іх было трое, маладых, не пазбаўленых налёту інтэлігентнасці, сучасных студэнтаў. Сіл і энергіі юнакам было не пазычаць, а вось што датычыцца фантазіі, тут справы, відаць, ішлі не вельмі... Чым заняліся б на іх месцы ў старыя добрыя часы? Шуканнем філасофскага каменя? Праектаваннем вечнага рухавіка? Ці, на благі канец, стварэннем чарговага бессмяротнага твора ў гонар дамы сэрца? Нашы «тры волаты» палічылі падобныя заняткі недастойнымі сапраўдных мужчын. А паколькі лічба «тры» абавязвае да дзеяння, яны не прымусілі сябе чакаць і неяк самі сабой апынуліся ў пункце, вядомым шырокай публіцы пад назвай ПНУ (піўная насупраць універсітэта).

Аб астатнім можна толькі здагадвацца. Хто з троіцы па колькі прыняў на душу, дакладна невядома, але дню 16 красавіка суджана было закончыцца, мякка кажучы, непрыемна.

Прафесар Шмутцар ужо чытаў сваю лекцыю, калі трое, упэўнена адчыніўшы дзверы, не зусім упэўнена зайшлі ў аўдыторыю. Паветра напоўнілася далёка не араматам руж...

Не стану надакучваць чытачам падрабязным расказам пра тое, як стала дрэнна Іванову, як выводзілі Гурскага і Старавойта. Не бяруся меркаваць, што падумаў прафесар Шмутцар, затое дакладна ведаю, што думаюць наконт гэтага студэнты 4-га курса, таго самага, дзе вучылася гэтая, далёка не святая, троіца. Ды і члены камітэта камсамола фізфака не трымаюць у сакрэце сваіх меркаванняў: ад гэтай плямы факультэт адмыецца не хутка. І ў даным выпадку не так важна, што студэнты тыя лічыліся ўвогуле неблагімі рабятамі, нядрэнна вучыліся, а Старавойт на працягу двух гадоў з'яўляўся нават камсоргам групы. Проста ёсць рэчы, якія ні дараваць, ні выправіць нельга. Мінула пара ружовага дзяцінства, калі маці, даўшы для парадку па карку, гаварыла: «Прасі прабачэння ў дзядзькі...» Надышоў час асабістай адказнасці за ўласныя ўчынкі, без ратавальных бацькоўскіх падказак...

## З ЖЫЦЦЯ «БЛУКАЮЧАЙ ЗОРКІ»

Адразу папярэджу — асоба, пра якую пойдзе размова, — у нейкім родзе славутасць. Праўда, не пытайцеся пра яго на факультэце. Нягледзячы на амаль пяцігадовае знаходжанне ў радах студэнцтва, у групе, а тым больш на курсе яго бачаць нячаста. Затое камендант і жыхары інтэрната № 2 могуць бясконца, з падрабязнасцямі і самымі нечаканымі эпітэтамі расказваць пра багатае на падзеі жыццё Яўгена Казлоўскага. Ён, безумоўна, знаходка для пішучай брацііі: адначасова і прататып, і пастаўшчык сюжэтаў. Але ўстрымаюся ад спакусы: хай раскажуць аб ім скупыя радкі пратакола пасяджэння камітэта камсамола фізфака:

«Студэнт 5-га курса Казлоўскі Яўген Анатолевіч за амаральныя паводзіны рашэннем камітэта камсамола фізфака ад 19 мая 1982 года быў выключаны з радоў ВЛКСМ. Аднак па хадайніцтву групы справа таварыша Казлоўскага не была перададзена ў камітэт камсамола універсітэта, а яму быў назначаны выпрабавальны тэрмін.

У верасні 1982 года Казлоўскі зноў быў затрыманы ў інтэрнаце ў нецвярозым стане. У пачатку кастрычніка таго ж года справа была перададзена для разгледжання на бюро камітэта камсамола БДУ. На пасяджэнне бюро таварыш Казлоўскі не з'явіўся, як, дарэчы, і на наступныя, нягледзячы на неаднаразовыя выклікі.

14 лютага 1983 года Казлоўскі быў затрыманы аператыўным атрадам інтэрната № 2, дзе ён разам са сваімі аднакурснікамі Е. Спасковым і А. Жыгадла ўчыніў бойку.

Пастанавілі: прасіць дэканат факультэта адлічыць Казлоўскага Я. А. з універсітэта».

І ўсё ж самае цікавае ва ўсёй гэтай гісторыі тое, што наш антыгерой, здаецца, адчувае сябе сапраўдным героем: і студэнт, і камсамолец, і дэбашыр у адной асобе. Каму яшчэ пад сілу такое сумяшчальніцтва?

## ЯК БЫЦЬ!

Піць ці не піць? Пра гэта другакурснік Аляксандр Колесаў не думаў. Ён ужо выпіў. А вось быць ці не быць на вечары адпачынку, гэта трэба было ўзважыць. Выкладчыкі, якія дзяжурылі ў той вечар, вырашылі, што Колесаву лепш не быць. Апошні рашыў біць...

Народны суд прыгаварыў Колесава Аляксандра Міхайлавіча да двух гадоў пазбаўлення свабоды (умоўна).

Дык піць ці не піць? У наступны раз Колесаў сур'ёзна падумае, перш чым даць станоўчы адказ. А астатнія, тыя, хто ўжо трапіў у разрад сумна вядомых? Пакуль што няясна. Уся надзея на тое, што ім дадуць зразумець, што ўсё гэта сапраўды сумна. А каб пакласці пачатак такой растлумачальнай рабоце, мы друкуем спіс усіх асабліва вылучыўшыхся адсутнасцю меры, прагай п'яных «подзвігаў» і сумніцельнай славы:

**Яротаў, Паляшчук, Карнейчык, Клачко, Хведчык (геаграфічны факультэт); Шараварaў, Храмцоў, Жук, Круковіч (фізічны факультэт); Карагін, Браткоўскі, Вараб'ёў (ФПМ); Абадкоў, Багданаў (гістарычны факультэт); Дзегцяроў, Ляшкоў (юрыдычны факультэт); Талочка (факультэт журналістыкі).**

Каментарыі, як кажуць, лішнія.

**Н. КАЛІШЭВІЧ,**
**наш кар.**

ТУРЫСЦКІМІ МАРШРУТАМІ

# ЭКЗАМЕНУЕ ПРЫРОДА

*Адгарэлі кастры, адзвінелі песні, утаймаваліся страсці — і раз'ехаліся, разышліся рабяты ў розныя канцы горада з адным жаданнем: убачыць родных, пасля няўтульнасці паходу прыняць душ, начытацца, нагаварыцца з сябрамі... Разыходзіліся і раз'язджаліся, каб адной хутка і пакутліва засмуткаваць, кінуцца да тэлефона:*

*— Іван Іванавіч, калі мы збіраемся?..*





МЫ — ГЭТА СЛУХАЧЫ факультэта грамадскіх прафесій БДУ імя У. І. Леніна аддзялення кіраўнікоў турыстычных секцый. ФГП — трынаццаты факультэт універсітэта, які дае магчымасць атрымаць грамадскую спецыяльнасць. Дзейнічае ён даўно. А вось аддзяленне турысцкіх арганізатараў створана толькі ў мінулым годзе сумесна з Беларускім рэспубліканскім саветам па турызму і экскурсіях.

На працягу навучальнага года мы авалодвалі тэарэтычнымі навыкамі кіраўніка турыстычнай секцыі, рыхтаваліся да вучэбнага паходу. Знаёміліся з турызмам у сістэме камуністычнага выхавання і фізічнай культуры, у сістэме комплексу ГПА, з вучэбна-выхаваўчай работай турысцкіх арганізатараў. Вывучалі турыстычныя магчымасці Беларусі, пытанні аховы прыроды, тэхніку і тактыку пешых паходаў. Вучыліся распрацоўваць план паходу, клапаціцца аб бяспецы, аказваць даўрачэбную дапамогу.

Але гэта была толькі тэорыя. На практыцы ўсё, безумоўна, павінна быць больш складана. Таму і быў запланаваны вучэбна-трэніровачны паход сумесна з аддзяленнем інструктараў турбаз рэспубліканскай школы турысцкага майстэрства. Патрэбна было на практыцы навучыцца арыентавацца, наладжваць быт, набываць арганізацыйныя навыкі кіраўніка турыстычнай секцыі.

Адпраўная кропка паходу — турыстычная база «Браслаўскія азёры», што размясцілася на беразе возера Дрывяты. Адсюль наша невялічкая флатылія «ўзняла ветразі». Возера пераліваецца пад сонечнымі праменнямі, здавалася, яно вітала нас. А нашы лодкі выпісвалі на вадзе зігзагі.

«Так бывае заўсёды, калі турысты ўпершыню ідуць у водны паход. Абавязкова трэба працаваць сінхронна, — успомніліся словы інструктара турбазы А. Ф. Чуеўскага. — Убачыце, якой роўнай калонай будзем вяртацца назад».

— Вось і адбылося наша першае «воднае хрышчэнне», — жартаваў назаўтра Алег Піліпавіч.

І зноў пераход, арганізацыя лагера на Чайчыным востраве, з якога рабілі выхады па сістэме азёр.

Чайкі над возерам, ціхі плёскат хваль, крыштальныя пырскі. Міжволі прыпамінаеш словы Алега Піліпавіча: «На дзве рэчы можна глядзець не адрываючыся—на агонь і ваду. Кожны раз бачыш штосьці новае, непаўторнае. Асабліва калі над вадой, як зараз, гуляе вецер».

Захапляючыя краявіды адкрыліся перад намі з «Вышкі» — самага высокага месца Браслаўскіх азёр. З аднаго боку пабліскваля, пераліваліся пад сонцам возера Снуды, а з другога — возера Струста. Неба быццам падзелена на дзве палавіны. Адна паступова цямнее, становіцца ўсё больш грознай, другая — бяздонная, уся ў белых хмарах, праз якія прабіваюцца сонечныя промні.

...Начная цішыня лесу. І толькі, разганяючы вячэрні змрок, прабіваецца праз сосны агеньчык. Ля кастра сядзяць турысты, разам з імі з гітарай у руках Віктар Мікалаевіч Савін, вопытны турыст, інструктар турбазы. Турысцкія песні, ціхая гаворка: успаміны, уражанні, жарты...

Скончыўся наш пяцідзённы паход. Але мы не развітваемся. Наперадзе — сустрэчы, заняткі, новыя турысцкія кастры.

**А. ПЕКАР,**
**студэнтка факультэта журналістыкі, слухачка аддзялення кіраўнікоў турысцкіх секцый ФГП.**

Фота **С. Плыткевіча.**





● СПОРТ

## ТЫДЗЕНЬ БАДЗЁРАСЦІ І ЗДАРОЎЯ

ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ прайшоў тыдзень ГПА. Ён пачаўся з першынства ВНУ па летняму мнагабор'ю. На старт выйшлі студэнты адзінаццаці факультэтаў. Лепшых поспехаў дабіліся каманды юрыдычнага, механіка-матэматычнага факультэтаў, факультэта радыёфізікі і электронікі.

У святочныя дні звыш 400 студэнтаў і супрацоўнікаў адправіліся ў зорныя турыстычныя паходы па месцах баявой славы савецкага народа. Сотні фізкультурнікаў выйшлі на універсітэцкі стадыён. Студэнты выпрабавалі сябе і на блакітных дарожках басейна.

Быў арганізаваны турнір па стральбе на прыз Героя Савецкага Саюза доктара гістарычных навук, прафесара Д. П. Жмуроўскага, а таксама крос на прыз Героя Савецкага Саюза кандыдата філасофскіх навук, дацэнта М. Я. Зайцава.

За час правядзення тыдня ва універсітэце павялічылася колькасць студэнтаў, якія цалкам здалі нормы ГПА.

**У. АБРАМОВІЧ,**
**член праўлення спартыўнага клуба універсітэта.**

## ПЕРАМОЖНЫЯ СТАРТЫ

На першынстве БССР па класічнай барацьбе сярод моладзі ўдала выступілі студэнты універсітэта. Чэмпіёнам спаборніцтваў стаў Вадзім Коржаль (геафак), трэцімі прызёрамі названы Святаслаў Коржаль (геафак), і Віталь Бракарэнка (фізфак).

**В. РУДЗЯНКОЎ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

● ПАРАДЫ ЎРАЧА

# ЛЕТА — ЧАС АДПАЧЫНКУ

З НАСТУПЛЕННЕМ вясенняй пары мы часцей задумваемся, як лепш выкарыстаць свой водпуск. І многія з нас збіраюцца на поўдзень, каб там загарэць і набрацца сілы, паправіць здароўе. Што ж, калі такая паездка не выклікае пярэчанняў у лечачага ўрача, то можна пажадаць добрага шляху.

Але большасць мінчан свой водпуск праводзяць у межах Беларусі. Цудоўная яе прырода... Рэспубліка славіцца хвойнымі лясамі, прыгожымі рэкамі і крыштальна празрыстымі азёрамі, разнастайным пейзажам. Той, хто пабываў на возеры Нарач, з удзячнасцю ўспамінае аб гэтым цудоўным краі. А колькі радасці і ўражанняў прыносіць адпачываючым паездка на Браслаўскія азёры, дзе шмат сонца, выдатныя пясчаныя берагі, цудоўны бярозавы гай. Карысна адпачываць і пад Мінскам, у маляўнічых лясных прыгарадах, на вадасховішчах Пціч, Вяча, Заслаўскае. Вучонымі ўстаноўлена, што па колькасці і па сіле сонечнай радыяцыі Беларусь не ўступае паўднёвым раёнам Украіны.

Калі чалавек практычна здаровы і не адчувае патрэбы ў спецыяльным курортным лячэнні, то яму не абавязкова ў час водпуску ехаць на поўдзень.

Пры жаданні, не выязджаючы за межы Беларусі, можна добра адпачыць, выкарыстоўваючы спрыяльнае ўздзеянне паветра, сонца і вады.

Значныя масівы хвойных лясоў у комплексе з вадаёмамі ствараюць пэўны мікраклімат, які спрыяльна ўздзейнічае на арганізм. Гэта выражаецца ў заспакойваючым уздзеянні на нервовую і сардэчна - сасудзістую сістэмы, паляпшэнні абмену рэчываў і ўмацаванні засцерагальных функцый арганізма.

Адпачынак патрэбна пачынаць з загартоўвання арганізма, таму што загартаваны арганізм лягчэй пераносіць ваганні знешняй тэмпературы і фізічныя нагрузкі. Ва ўмовах клімату нашай рэспублікі, з частымі перападамі тэмпературы паветра, вільготнасцю, гэта асабліва важна. Загартаваныя людзі вызначаюцца добрым здароўем, рэдка хварэюць, хутчэй папраўляюцца.

Прыступаючы да загартоўвання, патрэбна прытрымлівацца наступных асноўных правілаў: загартоўванне неабходна праводзіць з улікам стану свайго здароўя, таму перш чым прыступаць да загартоўвання, парайцеся з урачом. Толькі сістэматычна выконваючы загартоўваючыя працэдуры, вы выпрацуеце новыя засцерагальныя рэакцыі арганізма, якія, аднак, могуць быць страчаны, калі загартоўванне перапыніць.

Сонечныя ванны ўмацоўваюць здароўе чалавека, але карыстацца сонцам патрэбна ўмела. Нельга забываць, што пры шэрагу захворванняў забараняецца загартоўванне сонцам. Пры няўменні карыстацца сонечнымі ваннамі ці злоўжыванні імі, пры жаданні як мага хутчэй і больш загарэць — можна атрымаць апёкі ці сонечны ўдар. Магчыма і сонечная ліхаманка, калі тэмпература цела падымаецца да 40 градусаў. Наступае цяжкае захворванне нервовай сістэмы і ўнутраных органаў.

Як жа разумна выкарыстоўваць летняе сонца? Добра пачынаць прыём сонечных ваннаў пасля паветраных, але толькі пры добрым самаадчуванні. Лепшы час для прыёму сонечных ваннаў ад 10 да 13 гадзін дня, праз 45—60 мінут пасля прыёму ежы, а заканчваць за гадзіну да ежы.

У летні адпачынак загартоўваючай працэдурай з'яўляецца купанне, якое рэкамендуецца пры тэмпературы вады не ніжэй 18 градусаў і пры тэмпературы акаляючага асяроддзя не ніжэй 21—22 градусаў. Перад купаннем неабходна на працягу 5—10 хвілін пабыць у цяні, але не дапускаць ахаладжэння. Скура павінна быць цёплай перад купаннем, таму што рачная вада аднімае у цела цяпла больш, чым паветра. І таму калі скура ахаладзілася, нельга ўваходзіць у ваду, патрэбна расцерціся ручніком. Знаходзячыся ў вадзе, рухайцеся, плавайце, калі ж адчуеце холад, тэрмінова выходзьце з вады.

У першыя дні лепш купацца адзін раз у дзень, пачынаючы з 5—6 хвілін, а затым павялічваць да 15 хвілін і больш.

Вада — лекавы фактар, здымае стомленасць, садзейнічае ўмацаванню арганізма, але яна мае свае законы. Таму не трэба сваволіць на вадзе: штогод яна забірае тысячы чалавечых жыццяў. У стане ўзбуджэння, невялікага недамагання, а тым больш лёгкага ап'янення патрэбна ацаніць свае рэальныя магчымасці, перш чым уваходзіць у ваду. Толькі тады, калі вадой карыстаюцца ўмела, яна сапраўдны сябар чалавека.

Прыемнага вам адпачынку!

**В. СЦЯЖКО,**
**урач.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
19 мая 1983 г.
Зак. 945. АТ 04242

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ